# ГІСТАРЫЧНЫЯ СТАРОНКІ Ў КАШТОЎНАСНАЙ ПАРАДЫГМЕ СУЧАСНЫХ БЕЛАРУСКІХ РАЁННЫХ ГАЗЕТ

***І. А. Івашка***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*ivashkoirina9@gmail.com*

*Навуковы кіраўнік – К. В. Лакцевіч,*
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт*

У артыкуле разгледжаны асаблівасці афармлення гістарычных старонак у беларускім мясцовым друку. Зроблена выснова, што функцыянаванне спецыяльных палос у раённых газетах Беларусі абумоўлена дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкай, скіраванай на захоўванне калектыўнай памяці пра ВАВ, дакументалізацыяй сведчанняў пра ваенныя падзеі, а таксама мемарыялізацыяй памяці пра ўдзельнікаў ВАВ і пацярпелых ад яе наступстваў.

***Ключавыя словы:*** гістарычныя старонкі; раённыя выданні; каштоўнасная парадыгма; гістарычная памяць.

# ИСТОРИЧЕСКИЕ СТРАНИЦЫ В ЦЕННОСТНОЙ ПАРАДИГМЕ СОВРЕМЕННЫХ БЕЛОРУССКИХ РАЙОННЫХ ГАЗЕТ

***И. О. Ивашко***

*Белорусский государственный университет,*
*ул. Кальварийская, 9, 220004, г. Минск, Республика Беларусь,*
*ivashkoirina9@gmail.com*

*Научный руководитель – Е. В. Локтевич,*
*кандидат филологических наук, доцент*

В статье рассмотрены особенности оформления исторических страниц в белорусской местной печати. Сделан вывод, что функционирование специальных полос в районных газетах Беларуси обусловлено государственной информационной политикой, направленной на хранение коллектив-

ной памяти о ВОВ, документализацией свидетельств о военных событиях, а также мемориализацией памяти об участниках ВОВ и пострадавших от нее последствий.

***Ключевые слова:*** исторические страницы; районные издания; ценностная парадигма; историческая память.

Большасць гістарычных палос сучасных беларускіх мясцовых выданняў прысвечана падзеям Вялікай Айчынай вайны. Падобны кантэнт прадстаўлены «Да 80-годдзя Перамогі», «Маленькія сведкі вялікай вайны», «Расстраляныя лёсы», «Память бессмертна», «Шагая по улице героя» і г. д. Некаторыя з іх функцыянуюць не толькі як пастаянныя палосы ці палосы, прысвечаныя святочнай даце (дню Перамогі, гадавіне са дня вызвалення Беларусі, дзень памяці Хатыні, Міжнародны дзень памяці вязняў канцлагероў і пад.), але і як спецыяльныя праекты рэдакцый. Такая заканамернасць бачыцца невыпадковай, паколькі ВАВ, не выключаючы павышанай увагі да іншых эпізодаў шматвекавой гісторыі [1], «з'яўляецца адной з ключавых падзей гісторыі Беларусі і важным кампанентам палітыкі нацыянальнай памяці» [2, с. 69]. Да таго ж павышаны інтарэс медыядаследчыкаў да дыскурса гістарычнай памяці, на думку К. Ю. Алёшынай, М. Я. Блоха, Т. А. Разуваевай і А. В. Камплеева, звязаны са змяненнем вывучэння суадносін гісторыі і памяці, а таксама павелічэннем інтарэсу грамадства да падзей мінулага [3, с. 40].

Асаблівасці функцыянавання палос гістарычнай тэматыкі разгледзім на прыкладзе чатырох раённых газет. Так, журналісты **«Навін Старадарожчыны»** І. Кандаўрава і В. Патоцкая апелююць да падобнага кантэнту на трох спецыялізаваных палосах – *«Память», «80-летию Великой Победы посвящается» і «Улица имени героя»*. Цэнтральнымі асобамі іх матэрыялаў з'яўляюцца ўдзельнікі баявых дзеянняў, партызаны, дзеці вайны, а таксама родныя людзей, якія перажылі Вялікую айчынную вайну. Цэласную карціну апісваемых падзей чытачу дапамагаюць сфарміраваць таксама архіўныя фотаздымкі, ваенная хроніка і вытрымка з узнагародных папер ці дакументаў. Пры гэтым кожны матэрыял займае асобную паласу ці разварот.

Гістарычныя старонкі выдання, дзякуючы аўтарскай інтэрпрэтацыі матэрыялу, набылі шэраг асаблівасцей:

1) раскрыццё героя публікацыі ажыццяўляецца праз храналогію «мінулае – сучаснасць», а таксама вобразы/аповеды членаў сям'і;

2) ваенны лёс раёна апісваецца ў кантэксце запуску мясцовых ініцыятыў, накіраваных на захаванне гістарычнай памяці: *«Это было одно из тех хороших, настоящих дел, которые однажды начинаются с обычной публикации в районной газете. В нашем случае – с заметки о том, что администрация района запланировала реконструкцию мемориального комплекса»* (материал «В списках значатся», 17.05.2025 г.);

3) гісторыя раёна раскрываецца праз прыналежнасць да Старых Дарог герояў Вялікай Айчыннай вайны, у гонар якіх названы вуліцы райцэнтра: *«Эта крепкая крестьянская семья жила размеренной жизнью, разрастаясь год от года. Но война сумела вырубить ее едва ли не под корень: на фронте сложили головы шесть из восьми сыновей Аксеневичей»* («Сыновья уходят в бой», 03.05.2025 г.);

4) стварэнне эфекта прысутнасці пасродкам ўжывання ў публікацыях успамінаў сведкаў ці урыўкаў з мемуараў: *«Над полями и лугами, лесами и болотами прокатилось громкое эхо. Недаром мы назвали операцию “Эхо на Полесье”. Слушайте, фашисты, его раскаты!»* («Этот металл я ношу в себе до сих пор», 10.05.2025 г.); *«Иной раз нескольких минут хватало для того, чтобы поседели виски, сердце окаменело от утраты дорогого человека и с губ невольно слетали слова: “Боже, спаси и сохрани…”»* («Судьба разведчика», 10.05.2025 г.).

У вілейскім **«Шляху Перамогі»** выходзяць палосы *«80 лет Победы/ 80 год вызвалення Беларусі»*. Як правіла, старонкі змяшчаюць некалькі матэрыялаў, аб’яднаных тэматыкай Вялікай Айчыннай вайны. Жанравая палітра спецыяльных палос аб’ядноўвае кароткія заметкі пра ветэранаў («Дорогое имя», 08.05.2025 г.), справаздачы («Забота о ветеранах – наш приоритет», 08.05.2025 г.), успаміны дзяцей вайны («Дзяцінства, апаленае вайной», 09.04.2025 г.; «Вместе с дымом летели и клочья одежды», 29.04.2025 г.). Да сакавіка 2025 года выданне выпускала таксама гістарычную старонку *«80 мірных гадоў»*, прысвечаную аповедам пра мінулае спаленых вёсах Вілейскага раёна («Любчанская трагедыя: як гэта было»22.03.2025 г.; «Сцёрлі з твару зямлі, але не сцёрлі з памяці», 26.04.2025 г.). Адметна, што значную долю кантэнту разгледжаных палос складаюць заметкі пра мерапрыемствы і праекты, прысвечаныя помным датам, звязаных з ВАВ («День память», 05.04.2025 г.; «В память о каждом третьем», 12.04.2025 г. і інш.).

Валожынская **«Працоўная слава»** спецыялізаваны гістарычны кантэнт змяшчае ў *праекце «Они идут к нам как Герои…»* (рубрыка «Векапомнае»). Паводле пазіцыянавання рэдакцыі, такія старонкі

расказваюць чытачам «аб земляках, якія жылі ў ваенныя і пасляваенныя гады». У цэнтры публікацый аказваюцца аповеды нашчадкаў ветэранаў («Горжусь быть правнуком Победы», 18.04.2025 г.; «Суждено быть живым!», 16.05.2025 г.) ці людзей, родных якіх вывозілі на прымусовую працу («Недетские картины памяти», 03.05.2025 г.; «Мучительное путешествие», 10.05.2025 г.), вершы («Волнительно! Торжественно! Незабываемо!», 16.05.2025 г.), радзей – заметкі пра афіцыйныя сустрэчы з дзецьмі вайны і былымі вязнямі канцлагераў («Делегация благодарности», 10.05.2025 г.).

У большасці буйных публікацый І. Далідовіч ўспаміны з'яўляюцца цэнтральнымі элементамі гісторый: *«Очнулся только тогда, когда хрупкая санитарочка перемещала небольшими рывками его израненного, что-то шептала и закрывала рану бинтами <…>. Навсегда отец запомнил голос и глаза своей спасительницы»* («Суждено быть живым!», 16.05.2025 г.); *«Состав буквально разорвало на две части, почти сразу после высадки. Тогда впервые охватил всех страх щемящий и невыносимый»* («Цена Победы», 11.04.2025 г.). Акрамя таго, аповеды дапаўняюцца здымкамі відавочцаў падзей, а таксама фатаграфіямі дакументаў і месц Германіі, дзе ў ваенны перыяд працавалі героі матэрыялаў (дэпо Кёльна, сядзіба Мюнстэра і інш.).

У **«Нашым часе»** (Ельск) гістарычныя старонкі функцыянуюць у межах *праекта «Імя ў гісторыі»*, а таксама базуюцца на матэрыяле публікацый выдання мінулых гадоў (палосы «Праз прызму часу» і «Маршрутамі памяці»). Газета звяртаецца да матэрыялаў як без інфармацыйнай нагод і стрыжнявых герояў, так і да публікацый, якія ў тэксце маюць абгрунтаванне: *«Вспоминают всех погибших в той страшной войне, говорят об их судьбах, а имени моего отца нигде не указано на памятнике, к сожалению. Пока я жива, хочу восстановить справедливость»* («В списках не значится…», 24.08.2024 г.). Так, у выданні выходзяць праблемныя матэрыялы («В списках не значится…», 24.08.2024 г.); тэксты, якія расказваюць гісторыю помнікаў і даюць кароткія звесткі пра пахаваных у брацкіх магілах («Стоит у дороги, голову склонив, солдат», 01.02.2025 г.; «На 137-й высоте», 11.01.2025 г.); знаёмяць з бібліяграфічнымі звесткамі відавочцаў трагедый спаленых вёсак («Заболотье – вечная боль и скорбь», 11.01.2025 г.) ці асоб, імёнамі якіх названы вуліцы Ельска («Застенчивый любимец женщин», 01.02.2025 г.). Асаблівасцю аўтарскіх паведамленняў з'яўляецца падыход, пры якім крыніцамі інфармацыі журналістаў Г. Булаўка, Т. Петрухно, Ж. Найман, Я. Івановай выступаюць не толькі

размовы з героямі матэрыялаў, але і пісьмовыя сведчанні – выпіскі з дакументаў, лісты з фронта («Фронтовые треугольники – это святыня...», 11.02.2025 г.).

Такім чынам, функцыянаванне гістарычных старонак ў раённых выданнях Беларусі абгрунтавана шэрагам прычын: ажыццяўленнем дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі, скіраванай на захоўванне калектыўнай памяці пра ВАВ, недапушчэнне рэабілітацыі нацызму і фальсіфікацыі гісторыі; дакументалізацыю сведчанняў пра ваенныя падзеі ў розных рэгіёнах краіны. Разам з тым публікацыі ў мясцовым друку мемарыялізуюць памяць пра беларусаў, якія сталі ўдзельнікамі ВАВ ці пацярпелі ад яе наступстваў. Пра гэта сведчыць як агульны тон гістарычных палос, так і асобныя публікацыі: *«Пока я жива, хочу, чтобы имя моего отца не было забыто. <...> Хочу, чтобы фамилия Трошко Антона Алксеевича не канула в лету»* (НГ, «В списке не значится...», 24.08.2024 г.); *«Знаю, что у миллионов семей война тое забрала родтвенников. лавное, что мы можем сделать в их память <...> никогда не забывать их имена»* (НГ, «Фронтовые треугольники – это святыня...», 11.02.2025 г.); *«Я – правнук ветерана Великой Отечественной войны Михаила Ивановича Баталенка. Мне очень хочется, чтобы о его подвиге узнало как можно больше людей»* (ПС, «Горжусь быть правнуком Победы!», 18.04.2025 г.) і пад. А паколькі аснову гістарычнай памяці чалавека стварае камунікацыйнае і інфармацыйнае асяроддзе, дзе ён знаходзіцца, мясцовыя газеты становяцца крыніцамі ўнікальнай інфармацыі, што дазваляюць пераносіць вопыт мінулага ў сучаснасць для фарміравання маральнага, каштоўнасна-арыентуючага падмурка, які фарміруе калектыўную памяць і свядомасць народа.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Валаханович И.* Год исторической памяти в контексте трендов исторической политики уходящего 2022 года и наступающего 2023 года. URL: https://socio.bisr.by/aktualnye-aspekty-v-istoricheskoj-pamjati-belorusov (дата обращения: 15.05.2025).
2. *Ковба Д. М.*, *Грибовод Е. Г.* Особенности формирования и реализации политики памяти о Великой Отечественной войне на постсоветском пространстве // Дискурс-Пи. 2020. № 2(39). С. 59–77.
3. Глобальный конфликт прошлого в современном медиапространстве: историческая память в дискурсивном ракурсе / Алёшина Е. Ю. [и др.] // Galactica Media: Journal of Media Studies. 2021. № 4. С. 17–50.